УА ―Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
Факультэт дадатковай адукацыі

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Першы прарэктар БДУКМ
________________ Ю.П.Бондар
―___” ________________2012 г.

ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ

# Краязнаўства

спецыяльнасці перападрыхтоўкі
1-23 02 71 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія
кваліфікацыя: *бібліятэкар-бібліёграф*
у адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам перападрыхтоўкі,
зацверджаным 03.11.2010 г., рэг.№ 25-17/189

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск 2012

Распрацоўшчык праграмы:
В.І.Саітава, дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі інфармацыйна – дакументных камунікацый установы адукацыі „Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат педагагічных навук, дацэнт

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рэкамендавана да зацвярджэння:

Саветам факультэта дадатковай адукацыі УА „Беларускі дэяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
Пратакол паседжання ад ____________ № ______

Навукова – метадычным саветам УА „Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
Пратакол паседжання ад ____________ № ______

# УВОДЗІНЫ

Вучэбная дысцыпліна –Краязнаўства” з'яўляецца абавязковай для падрыхтоўкі бібліятэкараў-бібліёграфаў вышэйшай кваліфікацыі. Актуальнасць вывучэння гэтай дысцыпліны абумоўлена неабходнасцю засваення слухачамі прафесійных ведаў, уменняў і навыкаў па ажыццяўленні краязнаўчай дзейнасці бібліятэкі.

Мэтамі дысцыпліны –Краязнаўства” з'яўляюцца вывучэнне слухачамі тэарэтыка-метадалагічных, арганізацыйных, метадычных і тэхналагічных пытанняў краязнаўчай дзейнасці бібліятэк; фарміраванне уменняў і навыкаў па стварэнні і выкарыстанні краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў.

Мэтавая накіраванасць дысцыпліны абумоўлівае кола задач, рэалізацыя якіх забяспечыць фарміраванне неабходных для спецыялістаў ведаў, уменняў і навыкаў.

У выніку вывучэння дысцыпліны –Краязнаўства” слухачы *павінны уяўляць:*

– паняційны апарат, тэарэтычныя палажэнні бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства;

– асноўныя цэнтры бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства, арганізацыю краязнаўчай дзейнасці бібліятэк розных відаў і кіраванне ёю, функцыі структурных падраздзяленняў па краязнаўстве; рацыянальнае размеркаванне кірункаў краязнаўчай дзейнасці ў бібліятэках розных відаў; узаемадзеянне бібліятэкі з іншымі арганізацыямі і ўстановамі ў галіне краязнаўства;

– віды краязнаўчых дакументаў; тэарэтычныя асновы фарміравання фонду краязнаўчых і мясцовых дакументаў;

– інфармацыйныя патрэбнасці краязнаўчага характару і групы спажыўцоў краязнаўчай інфармацыі;

– краязнаўчыя дакументныя, бібліяграфічныя, фактаграфічныя рэсурсы, іх структуру, формы, тэхналогію бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці з імі;

– формы папулярызацыі краязнаўчых ведаў сярод мясцовага насельніцтва і карыстальнікаў бібліятэкі.

У выніку засваення гэтых ведаў слухачы *павінны умець выкарыстоўваць:*

– тэарэтычныя, метадычныя і тэхналагічныя веды, уменні і навыкі як кампанент прафесійнай падрыхтоўкі да дзейнасці па бібліятэчна-бібліяграфічным краязнаўстве;

– тэхналагічныя працэсы і аперацыі па фарміраванні фонду краязнаўчых дакументаў, разнастайных частак ДБА, падрыхтоўцы і выкарыстанні крыніц бібліяграфічнай, фактаграфічнай інфармацыі ў розных кірунках краязнаўчай бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці;

– пошукавыя сродкі Інтэрнета для выяўлення электронных інфармацыйных рэсурсаў аб рэгіёне (населеным пункце), даступных у онлайнавым рэжыме;

– нарматыўна-тэхналагічную дакументацыю для засваення працэсаў і аперацый практычнай краязнаўчай бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У выніку вывучэння дысцыпліны “Краязнаўства” слухачы *павінны валодаць уменнямі і навыкамі:*

– фарміравання краязнаўчага фонду бібліятэкі, вызначэння краязнаўчай каштоўнасці дакументаў;

– аналітыка-сінтэтычнай апрацоўкі краязнаўчых дакументаў;

– камплектавання, арганізацыі і выкарыстання кампанентаў краязнаўчага даведачна-бібліяграфічнага апарату ў традыцыйнай і электронных формах: каталогаў, картатэк, БД, даведачна-бібліяграфічнага фонду, фонду неапублікаваных бібліяграфічных дапаможнікаў, матэрыялаў банка даных “Народны архіў”;

– падрыхтоўкі розных відаў, жанраў, формаў краязнаўчай бібліяграфічнай прадукцыі, фарміравання і вядзення бібліяграфічных і фактаграфічных баз даных;

– абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк краязнаўчымі і мясцовымі дакументамі, бібліяграфічнымі, фактаграфічнымі, паўнатэкставымі і комплекснымі інфармацыйнымі прадуктамі і паслугамі.

Паспяховае засваенне слухачамі курса “Краязнаўства” магчыма на аснове ведаў, атрыманых пры вывучэнні такіх агульнапрафесійных і спецыяльных дысцыплін, як “Бібліятэказнаўства. Тэорыя”, “Бібліяграфазнаўства. Тэорыя”, “Дакументалогія” і інш.

У працэсе вывучэння дысцыпліны прадугледжаны наступныя віды заняткаў: лекцыі, семінар.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны “Краязнаўства” прадугледжваецца 38 гадзін, з іх 16 – аўдыторныя заняткі (лекцыі – 12, семінарскія – 4), 22 гадзіны самастойная работа.

Форма выніковага кантролю – залік.

Рэкамендуемыя метады (тэхналогіі) навучання

У ліку эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія садзейнічаюць прыцягненню слухачоў у пошук і кіраванне ведам!, набыццю вопыту самастойнага рашэння разнастайных задач, варта вылучыць:

- Тэхналогію навучальна-даследчай дзейнасці;
- Праектныя гэхналогіі;
- Метад аналізу канкрэтных сітуацый;
-Камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусіі, навучальныя дэбаты, мазгавы штурм);
-Гульнявыя тэхналогіі (дзелавыя, ролевыя, імітацыйныя гульні).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Назвы раздзелаў і тэм | Колькасць гадзін | | | |
|---|---|---|---|---|
| | усяго | лекцыі | семінарскія заняткі | самастойная работа |
| Раздзел I. Асновы тэорыі і арганізацыі краязнаўчай дзейнасці бібліятэкі | | | | |
| Тэма 1. Краязнаўства як грамадская з’ява | 2 | 2 | | |
| Тэма 2. Сутнасць і структура краязнаўчай дзейнасці бібліятэк | 6 | 2 | | 4 |
| Тэма 3. Карыстальнік бібліятэкі як аб’ект і суб’ект краязнаўчай дзейнасці | 4 | | | 4 |
| Тэма 4. Навуковая дзейнасць бібліятэк па краязнаўстве | 2 | 2 | | |
| Раздзел II. Інфармацыйна-бібліяграфічныя рэсурсы бібліятэкі па краязнаўстве | | | | |
| Тэма 5. Спецыфіка краязнаўчага фонду бібліятэк розных тыпаў і відаў | 8 | 2 | | 6 |
| Тэма 6. Краязнаўчы даведачна-бібліяграфічны апарат бібліятэкі | 4 | | | 4 |
| Тэма 7. Асаблівасці тэхналагічных этапаў падрыхтоўкі краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў | 6 | 2 | 4 | |
| Тэма 8. Жанрава-тыпалагічныя асаблівасці краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў | 6 | 2 | | 4 |
| Усяго | 38 | 12 | 4 | 22 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## Раздзел І. АСНОВЫ ТЭОРЫІ І АРГАНІЗАЦЫІ КРАЯЗНАЎЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ БІБЛІЯТЭКІ

### Тэма 1. Краязнаўства як грамадская з’ява

Прадмет, структура, задачы курса “Краязнаўства”. Яго месца ў сістэме прафесійнай падрыхтоўкі бібліятэкараў-бібліёграфаў. Веды, навыкі і ўменні, якія набываюць студэнты ў працэсе вывучэння курса. Яго ўзаемасувязі з іншымі спецыяльнымі дысцыплінамі інфармацыйна-дакументнага цыкла. Асноўныя віды вучэбных заняткаў. Формы кантролю. Характарыстыка забяспечанасці курса вучэбна-метадычнай літаратурай.

Вызначэнне паняцця “краязнаўства”. Фактары ўзнікнення і развіцця краязнаўства. Яго аб’ект, суб’ект, метады, крыніцы. Асноўныя формы арганізацыі краязнаўства і яго галіновая структура. Месца краязнаўства ў сістэме навуковых ведаў і грамадскай практыкі. Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства як самастойная галіна бібліятэчнай дзейнасці, яго сацыяльна-функцыянальная структура.

### Тэма 2. Сутнасць і структура краязнаўчай дзейнасці бібліятэк

Асаблівасці базавай (практычнай) і вытворных ад яе інфраструктурных відаў краязнаўчай дзейнасці: навукова-даследчай, вучэбна-выхаваўчай, арганізацыйна-кіруючай. Суб’ект і аб’ект бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства.

Краязнаўчая дзейнасць бібліятэк (КДБ) – базавая (практычная) падсістэма бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства. Комплексны характар краязнаўчай дзейнасці бібліятэк. Віды бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці, з якіх складаецца краязнаўчая дзейнасць бібліятэк.

Арганізацыя краязнаўчай дзейнасці бібліятэк паводле “Палажэння аб краязнаўчай рабоце бібліятэк Рэспублікі Беларусь” (28 снежня 1993 г.).

Абласныя універсальныя бібліятэкі як рэгіянальныя цэнтры краязнаўчай бібліятэчна-бібліяграфічнай работы ў краіне. Асноўныя напрамкі іх краязнаўчай дзейнасці.

Арганізацыя краязнаўчай дзейнасці ЦБС.

Роля Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі па навукова-метадычным забеспячэнні бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства.

### Тэма 3. Карыстальнік бібліятэкі як аб’ект і суб’ект краязнаўчай дзейнасці

Асноўныя групы карыстальнікаў краязнаўчай дакументальнай і бібліяграфічнай інфармацыі. Прафесійныя і непрафесійныя (дасугавыя) патрэбнасці. Асаблівасці патрэбнасцей краязнацаў-даследчыкаў. Метады вывучэння патрэбнасцей карыстальнікаў па краязнаўстве. Формы і метады задавальнення патрэбнасцей карыстальнікаў па краязнастве.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 4. Навуковая дзейнасць бібліятэк па краязнаўстве

Навукова-даследчая дзейнасць бібліятэк па краязнаўстве як кірунак дзейнасці бібліятэк розных тыпаў. Вызначэнне мэт навукова-даследчай дзейнасці ў нарматыўна-рэгламентуючых дакументах бібліятэк. Арганізацыйны аспект навукова-даследчай дзейнасці. Рэсурсны і сэрвісны аспекты бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства ў рэгіёне, уключэнне бібліятэкараў-бібліёграфаў краязнаўцаў у даследаванні па іншых галінах краязнаўства. Формы краязнаўчых даследаванняў, буйнейшыя сучасныя краязнаўчыя праекты беларускіх бібліятэк.

# Раздзел II. ІНФАРМАЦЫЙНА-БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ РЭСУРСЫ БІБЛІЯТЭКІ ПА КРАЯЗНАЎСТВЕ

## Тэма 5. Спецыфіка краязнаўчага фонду бібліятэк розных тыпаў і відаў

Паняцці ―краязнаўчы дакумент", ―мясцовы дакумент", ―рэгіянальны дакумент", ―краязнаўчы фонд", ―фонд мясцовых дакументаў", ―краязнаўчыя інфармацыйныя рэсурсы" і інш.

Структура, асаблівасці, уласцівасці краязнаўчага фонду бібліятэкі: тэматычны, тыпалагічны, відавы, храналагічны, моўны склад краязнаўчага фонду.

Асноўныя групы дакументаў, якія складаюць краязнаўчы фонд. Падфонды краязнаўчых дакументаў; мясцовых дакументаў; дакументаў, прысвечаных вядомым дзеячам і ўраджэнцам краю; дакументаў, якія прысвечаны тэорыі, методыцы і арганізацыі краязнаўства як галіны навуковай і практычнай дзейнасці.

Асаблівасці краязнаўчых фондаў бібліятэк розных тыпаў і відаў: універсальных навуковых, спецыяльных, публічных масавых.

Сукупны краязнаўчы фонд краю. Умовы стварэння.

## Тэма 6. Краязнаўчы даведачна-бібліяграфічны апарат бібліятэкі

Краязнаўчы даведачна-бібліяграфічны апарат (КДБА) бібліятэкі: паняцце, функцыянальнае прызначэнне, уласцівасці. Структура КДБА, формы існавання яго кампанентаў; прадстаўленне ў аддаленым доступе. Асаблівасці КДБА ў бібліятэках розных тыпаў.

Краязнаўчыя каталогі і картатэкі, іх функцыянальныя асаблівасці, тэхналогія фарміравання ў карткавым і электронным рэжымах. Крыніцы выяўлення, прынцыпы адбору і віды адлюстроўваемых дакументаў. Тэхналогія стварэння зводных краязнаўчых каталогаў. Каталогі мясцовых дакументаў: прызначэнне, аб'екты адлюстравання, структура.

Бібліяграфічныя і фактаграфічныя краязнаўчыя картатэкі: прызначэнне, віды, тэматыка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Краязнаўчыя базы даных (БД): бібліяграфічныя, фактаграфічныя і паўнатэкставыя.

Краязнаўчы даведачна-бібліяграфічны фонд (КДБФ): прызначэнне, камплектаванне, структура.

Фонд неапублікаваных краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў: прызначэнне, адбор бібліяграфічных матэрыялаў, фарміраванне.

## Тэма 7. Асаблівасці тэхналагічных этапаў падрыхтоўкі краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў

Асноўныя тэхналагічныя этапы падрыхтоўкі краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў.

Падрыхтоўчы этап: асаблівасці выбару і вывучэння тэмы, выяўлення яе бібліяграфічнай забяспечанасці, распрацоўкі плана-праспекта дапаможніка, выяўлення дакументаў. Выбар крыніц выяўлення дакументаў. Вядзенне рабочых картатэк.

Аналітычны этап. Агульны бібліяграфічны аналіз дакумента. Метадычныя патрабаванні да анатавання, рэферыравання, індэксавання краязнаўчых дакументаў.

Сінтэтычны этап. Крытэрыі адбору дакументаў. Групоўкі бібліяграфічных запісаў. Методыка складання дапаможных паказальнікаў (геаграфічнага, персаналій).

Заключны этап. Падрыхтоўка даведачна-пошукавага апарату, рэдагаванне дапаможніка і падрыхтоўка да друку. Патрабаванні да прадмоў, уводных тэкстаў. Удзел краязнаўцаў, вучоных і спецыялістаў у навуковым рэдагаванні.

Падрыхтоўка краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў з выкарыстаннем аўтаматызаванай тэхналогіі.

## Тэма 8. Жанрава-тыпалагічныя асаблівасці краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў

Тэхналогія і методыка складання папулярных краязнаўчых дапаможнікаў: універсальных, комплексных, галіновых, тэматычных, персанальных і біябібліяграфічных паказальнікаў, календароў знамянальных і памятных дат, аглядаў, папулярных бібліяграфічных энцыклапедый, нарысаў, даведнікаў, хронік.

Тэхналогія і методыка падрыхтоўкі навукова-дапаможных краязнаўчых бібліяграфічных паказальнікаў: універсальных бягучых і рэтраспектыўных, галіновых, тэматычных, персанальных і біябібліяграфічных.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**СЕМІНАРСКІЯ ЗАНЯТКІ**
**4 гадзіны**
**Тэма “Методыка падрыхтоўкі краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў”**

**Пытанні:**

1. Агульныя метадычныя асаблівасці рэкамендацыйных (папулярных) краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў.
2. Методыка падрыхтоўкі:
   a. Паказальнікаў тыпу “Што чытаць аб краі”.
   b. Календароў знамянальных і памятных дат і бібліяграфічных хронік.
   c. Краязнаўчых бібліяграфічных нарысаў.
   d. Краязнаўчых бібліяграфічных энцыклапедый, пуцевадзіцелей, анталогій.
3. Агульныя метадычныя асаблівасці навукова-дапаможных краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў.
4. Методыка падрыхтоўкі:
   a. Паказальнікаў тыпу “Новая літаратура аб вобласці (раёне, горадзе).
   b. Галіновых і тэматычных рэтраспектыўных паказальнікаў і даведнікаў.
   c. Персанальных паказальнікаў і біябібліяграфічных слоўнікаў.
   d. Паказальнікаў мясцовага друку.

Літаратура:

*Асноўная:*

*Мамонтов, А.В.* Краеведческая библиография : учебник / А.В.Мамонтов, Н.Н.Щерба. – М. : Кн. палата, 1989. – С. 133 – 161.

*Касінская, А.І.* Краязнаўчая бібліяграфія ва ўмовах інфармацыйных тэхналогій: традыцыі і навацыі / А.І.Касінская // Абласныя бібліятэкі : актуальныя аспекты дзейнасці : навук.-метад. выд. – Мн., 2004. – С. 38 – 45.

*Краеведческие* указатели и БД // Справочник библиографа. – Изд. 2-е, перераб. и доп. – СПб., 2003. – С. 420 – 431.

*Краязнаўчая* дзейнасць бібліятэк : метад. рэкамендацыі / НБ Беларусі ; склад. Р. М. Чыгірова, М. У. Сокал. — Мн., 1994. — 102 с.

*Маслова, А.Н.* Календари знаменательных и памятных дат / А.Н. Маслова // Мир библиогр. – 2002. – № 4. – С.12 – 16.

*Маслова, А.Н.* Тенденции развития краеведческой библиографии в Российской Федерации / А.Н. Маслова // Вестник БАЕ. – 2005. – №1. – С.82 – 88.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дадатковая:*


*Составление* краеведческих рекомендательных библиографических пособий типа ―Календарь знаменательных и памятных дат” : метод. рек. / ГПБ ; сост. Г.М. Вольберг. – Л., 1989. – 29 с.

*Составление* универсальных рекомендательных пособий о крае : метод. рек. / ГПБ ; сост. Г.М. Вольберг. – Л., 1988. – 46 с.

*Составление* универсальных текущих указателей краеведческой литературы : метод. рек. / ГПБ ; сост. Г.М. Вольберг. – Л., 1982. – 29 с.

*Толкунова, В.* Современные библиографические краеведческие издания как средство обеспечения доступа к краеведческой информации / В. Толкунова // Инф. бюл. РБА. – 2003. – № 24. – С. 176 – 178.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## САМАСТОЙНАЯ РАБОТА

### Тэма. Сутнасць і структура краязнаўчай дзейнасці бібліятэк, 4 гадзіны

**Заданне для СРС** – прааналізаваць тэарэтычныя аспекты – становішча распрацаванасці зместа і структуры бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства па прапанаваных крыніцах:

1.*Библиотечная* энциклопедия /РГБ. – М.: Пашков дом, 2007. – С.198 – 199.

2. *Библиотечное* краеведение*:* терминолог. словарь / сост. В.С. Крейденко, А.В. Мамонтов. – СПб., 1998. – 85 с.

3. *Кушнаренко, Н.Н.* Библиотечное краеведение: теоретико-методологический аспект: автореф. дис. … д-ра пед. наук / Н.Н. Кушнаренко; МГИК. – 1993. – 16 с.

4. *Мамонтов, А.В.* Библиотечное краеведение : учеб. пособие. Вып. 1. Основы краеведения / А.В.Мамонтов. – СПб. : Акад. культуры, 1996. – 36 с.

5. *Пирожков, Г.П.* Краеведение в условиях информатизации общества / Г.П.Пирожков // Библиотековедение. – 2007. – № 3. – С.42 – 45.

6. *Тараненко, Л. Г.* Информационное обеспечение региона: специфика краеведческой деятельности библиотек : [учеб. пособие] / Л. Г. Тараненко. – М. : Литера, 2009. – 160 с. – (Современная библиотека ; вып. 45).

7. *Щерба, Н.Н.* Библиотечное краеведение: сущность, внутренняя структура и внешняя среда / Н.Н. Щерба // Сов. библиотековедение. – 1992. – №5 – 6. – С.67 –76.

8. *Эстрина, Ю.Ю.* Библиотечное краеведение: актуальные проблемы / Ю.Ю. Эстрина // Науч. и техн. б-ки. – 2000. – № 6. – С. 119 – 122.

**Форма кантролю СРС:** 1. Праверка канспектаў.
2. Субяседаванне па тэме.

### Тэма. Карыстальнік бібліятэкі як аб’ект і суб’ект краязнаўчай дзейнасці, 4 гадзіны

**Заданне для СРС** –вывучыць тэарэтыка-метадычную распрацаванасць праблемы па прапанаваных крыніцах:

1.*Библиотечное* краеведение*:* терминолог. словарь / сост. В.С. Крейденко, А.В. Мамонтов. – СПб., 1998. – 85 с.

2.*Проблемы* краеведческой деятельности библиотек: материалы Всерос. науч.-практ. семинара (Великий Новгород, сентябрь 2002 г.). – СПб.: РНБ, 2003. – 258 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3.*Тараненко, Л. Г.* Информационное обеспечение региона: специфика краеведческой деятельности библиотек : [учеб. пособие] / Л. Г. Тараненко. – М. : Литера, 2009. – 160 с. – (Современная библиотека ; вып. 45).

**Форма кантролю СРС:** 1. Праверка канспектаў.
2. Субяседаванне па тэме.

**Тэма. Спецыфіка краязнаўчага фонду бібліятэк розных тыпаў і відаў, 2 гадзіны**

**Заданне для СРС:** пазнаёміцца з прапанаванымі крыніцамі і зрабіць параўнальны аналіз меркаванняў розных спецыялістаў аб сутнасці паняццяў: "краязнаўчы дакумент", "краязнаўчы фонд", "фонд краязнаўчых дакументаў".

1. *Акулич, С.Н.* О сущности понятия "краеведческий документ" / С.Н. Акулич // Сов. библиотековедение. – 1990. – №4. – С. 53 – 59.
2. *Библиотечное* краеведение: терминолог. словарь / сост. В.С. Крейденко, А.В. Мамонтов. – СПб., 1998. – С. 35.
3. *Криворотенко, С.Н.* Краеведческий фонд библиотек: учеб. пособие / С.Н. Криворотенко. – М.: Либерия-Бибинформ, 2002. – С. 5 – 16.
4. *Кушнаренко Н.Н.* Краеведение — конспект эпохи / Н.Н. Кушнаренко // Библиотекарь. – 1991. – №12. – С. 23 – 25.
5. *Лукашов, И.В.* Определение краеведческого качества документа / И.В. Лукашов // Библиотековедение. – 1996. – №3. – С. 67 – 75.
6. *Мамонтов, А.В.* Библиотечное краеведение : учеб. пособие. Вып. 2. Краеведческий библиотечный фонд / А.В.Мамонтов. – СПб. : Акад. культуры, 1998. – 38 с.

**Форма кантролю СРС:** 1. Праверка канспектаў.
2. Субяседаванне па тэме.

**Тэма. Асаблівасці фарміравання краязнаўчага фонду бібліятэк, 4 гадзіны**

**Заданне для СРС:** па прапанаванай літаратуры вызначыць асаблівасці фарміравання краязнаўчых дакументных рэсурсаў у бібліятэках Беларусі.

1. *Краязнаўчая* дзейнасць бібліятэк: метад. рэкамендацыі / НБ Беларусі; склад. Р.М.Чыгірова, М.У.Сокал. – Мн., 1994. – С. 38 – 42.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. *Вольберг, Г.М.* Краеведческая работа библиотек как основа возрождения национальной памяти / Г.М.Вольберг // Бібліятэка і нацыянальная праграма "Спадчына". – Мн., 1992. – С.14 – 23.

3. *Зыгмантовіч, С.В.* Краязнаўчыя рэсурсы бібліятэк: камплектаванне і выкарыстанне / С.В. Зыгмантовіч, В.І. Саітава // Інфармацыйныя рэсурсы бібліятэк і іх кадравае забеспячэнне: матэрыялы Міжнарод. навук.-практ. канф. (23-26 мая 2000г., Мінск). – Мн., 2000. – С. 91-94.

4. *Стрыжонак, І.М.* Краязнаўчыя інфармацыйныя рэсурсы ўніверсальных абласных бібліятэк Беларусі ва ўмовах новых інфармацыйных тэхналогій / І.М. Стрыжонак // Роль библиотек и информации в устойчивом развитии общества: материалы Междунар. научно-практ. конф. (Минск, 2005). – Мн.: Красико-Принт, 2006. – С. 123 – 127.

**Форма кантролю СРС:** 1. Субяседаванне па тэме.

**Тэма. Краязнаўчы даведачна-бібліяграфічны апарат бібліятэкі, 4 гадзіны**

**Заданне для СРС:** падрыхтаваць пуцевадзіцель па электронных краязнаўчых рэсурсах бібліятэк, даступных праз сайты.

Даследаваць віды краязнаўчых рэсурсаў абласных бібліятэк, ЦБС і спецыяльных бібліятэк (выбраць па дамоўленасці з выкладчыкам), даступных праз сайты: базы даных і электронныя каталогі, электронныя бібліяграфічныя паказальнікі, паўнатэкставыя дакументы, інфармацыя аб краязнаўчай дзейнасці бібліятэкі і інш. Звесткі па кожнаму выяўленаму рэсурсу прыводзяцца па магчымасці канкрэтна, з прыкладамі.

1. **Базы даных і электронныя каталогі:**
   1.1. назва
   1.2. тэрытарыяльны ахоп (тэрытарыяльны аб’ект)
   1.3. аб’ём (па магчымасці)
   1.4. пошук
2. **Электронныя бібліяграфічныя паказальнікі:**
   2.1. самастойныя прадукты ці электронныя версіі друкаваных
   2.2. назва
   2.3. тэрытарыяльны ахоп (тэрытарыяльны аб’ект)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1.3. доступ
1.4. пошук па змесце

3. **Паўнатэкставыя рэсурсы**

3.1. арыгінальныя, напісаныя спецыяльна для сайта. Агульная характарыстыка.

3.2. адсканіраваныя версіі бумажных дакументаў. Агульная характарыстыка (наяўнасць/адсутнасць версій рэдкіх і каштоўных краязнаўчых выданняў).

4. **Інфармацыя аб краязнаўчай дзейнасці самой бібліятэкі** (гісторыя бібліятэкі, навіны аб краязнаўчай рабоце, краязнаўчыя бібліятэчныя праекты і інш.).

5. **Спасылкі на інфармацыю аб рэгіёне ў Інтэрнет.**

6. **Фактаграфічныя звесткі** (прыклады разнастайнай тэкставай і статыстычнай інфармацыі аб рэгіёне, яго населеных пунктах, установах, арганізацыях, помніках культуры і інш.)

7. **Арганізацыя краязнаўчых рэсурсаў на сайце бібліятэкі.**

7.1. інфармацыя даступна праз блок ―Краязнаўства"

7.2. краязнаўчая інфармацыя размешчана па розных раздзелах сайта (канкрэтызаваць).

Пуцевадзіцель пажадана прадставіць у раздрукаваным выглядзе ці на электронным носьбіце.

**Форма кантролю СРС:** 1. Праверка пуцевадзіцелей.

## Тэма. Метадычныя асаблівасці асобных жанраў (тыпаў) краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў, 4 гадзіны

**Заданне для СРС:** авалодаць методыкай падрыхтоўкі бібліяграфічнага агляду. Рэгіён ці населены пункт выбіраецца па жаданні студэнта. Студэнт абгрунтоўвае тэму агляду, вызначае крыніцы выяўлення дакументаў, праводзіць іх адбор у колькасці не менш 7 дакументаў розных відаў (кніг, артыкулаў, фотаальбомаў, атласаў і інш.) Групоўка матэрыялу, характарыстыка дакументаў, структура агляду павінны адпавядаць методыцы падрыхтоўкі бібліяграфічных аглядаў.

Бібліяграфічны агляд можа быць прадстаўлены ў пісьмовым выглядзе ці як прэзентацыя ў Power Point.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*ЛІТАРАТУРА*

1. *Стрыжонак, І.М.* Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства: вучэбна-метадычны комплекс для студэнтаў V курса ФІДК і ІІІ – IV курсаў ФЗН / І.М.Стрыжонак, В.І.Саітава [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: Электронная бібліятэка БДУ культуры і мастацтваў.

2. *Михлина, И.И.* Отбор литературы по территориальному признаку в краеведческих пособиях / И.И. Михлина // Библиография. – 1998. – № 1. – С.35 – 39.

3.

**Форма кантролю СРС:** 1.Праверка пісьмовых аглядаў і прэзентацый.
2. Субяседаванне па тэме.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПЫТАННІ ДА ЗАЛІКУ

1. Краязнаўства. Аб’ект, формы арганізацыі.
2. Бібліятэчнае краязнаўства – галіна бібліятэчнай дзейнасці і комплексная тэарэтыка-прыкладная дысцыпліна.
3. Арганізацыя краязнаўчай дзейнасці бібліятэк.
4. Вызначэнне паняццяў "краязнаўчы дакумент", "мясцовы дакумент", "краязнаўчы фонд", "фонд мясцовых дакументаў", "падфонд краязнаўчых дакументаў" і інш.
5. Структура, асаблівасці, уласцівасці краязнаўчага фонда бібліятэкі.
6. Спецыфіка краязнаўчых фондаў бібліятэк розных тыпаў і відаў.
7. Сукупны краязнаўчы фонд.
8. Віды камплектавання краязнаўчага фонда.
9. Вызначэнне краязнаўчай каштоўнасці дакументаў.
10. Улік і апрацоўка краязнаўчых дакументаў.
11. Размяшчэнне і захаванне краязнаўчага фонда.
12. Краязнаўчы даведачна-бібліяграфічны апарат бібліятэкі (КДБА). Функцыі, уласцівасці, крытэрыі, структура.
13. Краязнаўчыя каталогі (карткавыя, электронныя, зводныя).
14. Краязнаўчыя картатэкі і базы даных.
15. Краязнаўчы даведачна-бібліяграфічны фонд (КДБФ) бібліятэкі.
16. Віды, тыпы і жанры краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў.
17. Асаблівасці працэсаў і аперацый падрыхтоўчага этапу.
18. Асаблівасці працэсаў і аперацый аналітычнага этапу.
19. Асаблівасці працэсаў і аперацый сінтэтычнага этапу.
20. Асаблівасці працэсаў і аперацый заключнага этапу.
21. Агульныя метадычныя асаблівасці падрыхтоўкі папулярных краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў.
22. Метадычныя асаблівасці падрыхтоўкі асобных тыпаў і жанраў навукова-дапаможных краязнаўчых дапаможнікаў.
23. Формы бібліятэчнага і бібліяграфічнага абслугоўвання па краязнаўству.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЛІТАРАТУРА


***Асноўная***

*СТБ ГОСТ 7.0-2004.* Інфармацыйна-бібліятэчная дзейнасць, бібліяграфія. Тэрміны і азначэнні = Информационно-библиотечная деятельность, библиография. Термины и определения. – Узамен ГОСТ 7.0–84, ГОСТ 7. 26–80; уведз. 2005 -03 -01. – Мн., [2004]. – 35 с.

*Бібліятэчна-бібліяграфічнае* краязнаўства: тэксты лекцый / аўт. І.М.Стрыжонак, В.І.Саітава [электронны рэсурс] / Бібліятэка БДУ культуры і мастацтваў.

*Библиотечное* краеведение // Библиотечная энциклопедия. – М., 2007. – С.198 – 199.

*Библиотечное* краеведение: терминолог. словарь / сост.: В.С.Крейденко, А.В.Мамонтов. – СПб.: Акад. культуры, 1998. – 85 с.

*Касінская, А.І.* Краязнаўчая бібліяграфія ва ўмовах інфармацыйных тэхналогій: традыцыі і навацыі / А.І.Касінская // Абласныя бібліятэкі: актуальныя аспекты дзейнасці: навук.-метад. выд. – Мн.: НББ, 2004. – С. 38–45.

*Краеведческие* указатели и БД // Справочник библиографа. – 2-е изд., перераб. и доп. – СПб.: Профессия, 2003. – С. 420–431.

*Краязнаўчая* дзейнасць бібліятэк: метад. рэкамендацыі / НБ Беларусі; склад. Р. М. Чыгірова, М. У. Сокал. — Мн.: НББ, 1994. – 102 с.

*Мамонтов, А.В.* Библиотечное краеведение: учеб. пособие. – СПб.: Акад. культуры, 1998. – Вып. 2. Краеведческий библиотечный фонд. – 38 с.

*Мамонтов, А.В.* Краеведческая библиография: учебник / А.В.Мамонтов, Н.Н.Щерба. – М.: Кн. палата, 1989. – 216 с.

*Михлина, И.И.* Основные понятия краеведческой библиографии: учеб-метод. пособие / И.И.Михлина. – М.: Профиздат, 2002. – 80 с.

*Неверова, Т.А.* Краеведческая деятельность библиотек / Т.А.Неверова. – М.: Либерия, 2005. – 136 с. (Библиотекарь и время. XXI век; вып. 28).

*Тараненко, Л. Г.* Информационное обеспечение региона: специфика краеведческой деятельности библиотек : [учеб. пособие] / Л. Г. Тараненко. – М. : Литера, 2009. – 160 с. – (Современная библиотека ; вып. 45).

***Дадатковая***

*Акулич, С.Н.* О сущности понятия «краеведческий документ» / С.Н. Акулич // Сов. библиотековедение. – 1990. – №4. – С. 46–53.

*Давыдова, М.* Краеведческая литературная библиография: направления развития, виды, методика составления библиографических пособий: лекции по курсу ―Библиография художественной литературы” / М. Давыдова. – М.: МГУКИ, 2003. – 23 с.

*Зыгмантовіч, С.В.* Краязнаўчыя рэсурсы бібліятэк: камплектаванне і выкарыстанне / С.В. Зыгмантовіч, В.І. Саітава // Інфармацыйныя рэсурсы бібліятэк і іх кадравае забеспячэнне : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф. (23–26 мая 2000 г., Мінск). – Мн.: Красіка-Прынт, 2000. – С. 91–94.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Краеведческая* библиография // Библиотечная энциклопедия. – М., 2007. – С.573 – 578.

*Лукашов, И.Б.* Определение краеведческого качества документа / И.Б. Лукашов // Библиотековедение. – 1993. – № 3. – С. 67–75.

*Лыч, Л.М.* Краязнаўства – крыніца ведаў і нацыянальнага сталення /Л. Лыч. – Мн.: Бел. фонд культуры, 2004. – 49 с.

*Макарова, Н.* Информационное обеспечение краеведения / Н. Макарова // Инф. бюл. РБА. – 2003. – № 24. – С.179–180.

*Маслова, А.Н*. Календари знаменательных и памятных дат / А.Н. Маслова // Мир библиогр. – 2002. – № 4. – С.12–16.

*Маслова, А.Н.* Тенденции развития краеведческой библиографии в Российской Федерации / А.Н. Маслова // Вестник БАЕ. – 2005. – №1. – С. 82–88.

*Михлина, И.И.* Краеведческая библиография в системе российской библиографии: теоретические основания: монография / И.И. Михлина. – Краснодар: КГУКИ, 2003. – 244 с.

*Михлина, И.И.* Отбор литературы по территориальному признаку в краеведческих пособиях / И.И. Михлина // Библиография. – 1998. – № 1. – С.35–39.

*Проблемы* краеведческой деятельности библиотек: материалы Всерос. науч.-практ. семинара (Великий Новгород, сентябрь 2002 г.). – СПб.: РНБ, 2003. – 258 с.

*Толкунова, В.* Современные библиографические краеведческие издания как средство обеспечения доступа к краеведческой информации / В. Толкунова // Инф. бюл. РБА. – 2003. – № 24. – С. 176–178.

*Шаталова, Н.* Информационные ресурсы краеведения: определение понятия Н.Шаталова // Библиотечно-библиографическая деятельность: межвуз. сб. науч. тр. / Тамбов. гос. ун-т им. Г.Р.Державина; отв. ред. А.А.Соболева. – 2003. – Вып. 2. – С. 85–90.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ